Цэна асобнага нумеру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перасылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць празвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўтарам не вертаюцца назад.

Год VII. 9 (22) лістапада 1912 г. №. 45.

## За апошні тыдзень.

Усюды ужо скончыліся выборы у Гас. Думу і выявілося, што як пачалі самі дэпутаты азначаць свае грамадзянскіе погляды, то апазыцыя у Думе куды зболышылася.

Партійная групіроўка дэпутатоў паводле апошніх вестах такая:

| | |
|---|---|
| Соціаль-дэмократоў | 16 |
| Трудавікоў | 1 |
| Левых | 17 |
| Кадэтоў | 65 |
| Поступоўцоў | 63 |
| Народоўцоў | 16 |
| Акцябрыстоў | 80 |
| Націоналістоў і умерэна правых | 67 |
| Правых | 108 |
| Безпартійных | 10 |

Пасьля гэтаго выходзіць, што апазыція будзе мець у IV Гас. Думе 161-го прэдстаўніка, гэта значыць 38 працэнт усіх галасоў. Калі-ж да апазыціі далічыць безпартійных і народоўцоў (палякоў), то агульнае чысло апазыційных галасоў дойдзе да 187, або 42-й працэнт усяго складу Думы, А ешчэ-ж партійная групіроўка дэпутатоў ня скончылася, яна, можна сказаць, цяпер ешчэ толькі началася; трэба думаць, што чысло апозыційных дэпутатоў ешчэ узрасьце на кошт правых і націоналістоў. Праўда, што у аднэй сваей палавіне Дума шмат направела, але затое у другой яна куды больш левая чым была трецяя Дума. Мост, каторы у трэцяй Думе злучаў правую і левую старану звузіўся на гібкую кладачку у чацьвёртай Думе.

Пад гоман балканской вайны насьпёваюць вялікіе здарэньня на Далёкім Усходзі. Гэтымі днямі апавесьцілі тэкст новай Расейска-Манголь-скай згоды, каторую падпісалі прэдстаўнік Расеі і члены новаго монгольскаго ураду. Гэта згода будзе мець вялікае значэньне у гісторыі стасункоў Расеі с Кітаем. Расею заўсёды больш цікавілі справы Монголіі, чым Манджуры,—але да кітайскай рэволюціі монгольскіе справы не выступалі так рэзка на чарод.

Заходная Монголія была з даўных часоў толькі для вока правінціей Кітаю, бо з экономічнаго боку саўсім залежала ад Расеі, ад шырокай таргоўлі з ей. Кітайская рэволюція перэвярнула усё на выварот. Пасьля гэтай рэволюціі монгольскіе князькі адчуваючы сваю сілу і бачучы поўнае безладзьдзе у новай рэспубліцы, апавесцілі Монголію вольнай ад кітайскай апекі. Але калі кітайскі рэспубліканскі урад справіўся з безладзьдзем у Кітаі, то паслаў карацельные экспэдыціі у Монголію, каторые зрабілі чыста азіяцкую расправу з монгольскімі «незалежнікамі» на усходзі; — заходня-ж часць Монголіі падалася у апеку да Расеі. Расейскі урад падпісаўшы згоду з монгольскім урадам, гэтым самым выказаў, што Монголію прызнае за незалежнае гасударство. Калі-ж гэту звестку паставіць разам с тым, што кітайская карацельная экспэдыція ідзе на заходню Монголію і што у Кітаі мобілізуюць войска, то будзе ясна, што Расею жджэ, на вясну 1913 году новая неспадзеянка на Далёкім Усходзе.

Нрынамсі, кітайцы з гэтым саўсім ня крыюцца і нават у іхніх афіціальных газэтах усё часьцей пішуць заклікаючы да вайны з Расеяй. Падбівае кітайцоў да вайны з Расеей, тое, што Расея праграла вайну з японцамі, а такжэ вайна на Балканах. Газэты націоналістоў расейскіх паднялі тон і ўжо загадзя маняцца „разграміць“ Кітай.

———

## ВАЙНА.

Паводле апошніх всетак з вайны, Баўгары падыйшлі да Константынопаля бліжэй, цяпер яны каля Чальтжы (каля 30 вёрст ат Константынопаля). Туркі рэдка адступаюць у парадку, а больш за ўсё яны уцекаюць хто куды можэ, без усякаго ладу. Пяхота уцекаючы разбівае отрады кавалерыі, каторая пастаўлена, каб задзержываць уцекаючых салдатоў. Генералы і афіцэры нічога ня могуць зрабіць.

Карэспандэнт аднэй нямецкай газэты. каторы абъехаў турецкіе пазыціі малюе страшны образ. Між Чальтжай і Хадэмкіоем—праўдзівая даліна сьмерці. Ад халеры уміраюць сотнямі. Скрозь валяюцца трупы. Калодзезі затручэны. Лекары ня здолеюць зрабіць што небудзь. Дысцыпліны у турэцкай арміі німа ніякай. Дзесятак генералоў і штабных афіцэроў распараджаюцца, пры чым загады аднаго ідуць супроць загадоў другога. Інспэктар турэцкай арміі Фуан-паша не таіць таго, што турэцкай арміі прышоў канец. Баўгары наступаюць безупынна.

Што і як ёсць с турэцкай крэ-

## „Ня усе-ж разам, ягомосьці!..“

II.

Самая пацеха пачыналася ня ў будзенны дзень, а ў нядзелю, або ў якое сьвята. Тады кожэн чэлавек мае вольны час і кожэн рупіцца праводзіць яго, як найлепей і весялей. У сьвяты дзень ня кончэ рахавацца з варункамі будзённаго жыцьця, і чэлавек цяпер мае спраможнасьць рабіць тое, што яму падабаецца, паводлуг свайго нораву і густу. Дзеля гэтага у карчму начынаюць збірацца ешчэ досьвіта, чуць золак, як толькі жанкі завінуцца каля печы. Ні дарма-ж у песьні сьпеваецца: „ўстане рана, не хрысьціца, моў, не памятае; ўстане рана, ня моліцца,—да карчмы дыбае“. Гаспадыня, шапочучы пацеры, гатуецца пячы блінцы, смажыць верашчаку, а гаспадар нашча падаецца у карчму. У карчме, кінуўшы агульнае „дзень добры“, кожэн сам сабе шукае мейсца. Хто захваціца раней, дык займае лепшае, пачэснае, за сталом, на лаве ці зэдліку; а хто спозьніцца, калі там саўсім патоўпіцца нельга, дык садзіцца на парозі ці проста ў куточку на падлозі, абы „не замінаць вельмі“. Размасьціўшыся, як каму давялося, кураць люлькі, зажываюць табаку, частуюцца тутуном сваей гадоўлі, хваляць добры, ганяць кепскі, а часам і заспрэчаюцца на гэтым грунце:

— Слухаць ня хочу! трасе галавою дзядзька: „Хіба гэта тутун? Гэта—капусьнік, а не тутун! Запробуй майго: уся хата чхае, як крышыць пачынаю! Жонка ка'а, ня трэ' лепшага лекарства ад катару“...

— Дарма, ня згоджваецца другі: у нос-то ён бье, але смаку, як сьледна, не мае. Дый пяршыць, дзярэ ў горлі..

— Ат, вярзе чэлавек, аж слухаць моташна!— Базыль! зьвертаёцца ён да другога: ты курыў? няўжож і ты скажэш...

Але Базыль ня слухае, і спрэчка хутка канчаецца. З боку пачалі размову пра чуткі, здарэньня, пра кірмаш...

—Ця-пер і Клецк і Капыль саўсім занепалі: казы добрае, ня то што, купіць не патрапіш! А даўней, яшчэ за маю памяць,—вядзе сівы, с пажоўклымі ад табакі вусамі, дзед:—дык мо'а на ўсём сьвеці гэткага кірмашу не было... Або вось Мір..

— Дык гібее народ, німа чаго казаць! Я сам памятаю, як у нас зямлі не хацэлі браць,—падаткаў, ці што, баяліся; пашы тае колькі было, быдла... А цяпер земля гэтаго ня родзіць. Я летась-дзе на навозах насеньня не сабраў!..

—Галеюць людзі да званьня, дадае трэйці: розуму не дабярэш, што гэта будзе, як далей жыць давядзецца! Мэрам ўсё нешта вернецца, руйнуецца і разваліцца ня можэ. Страхоцьця ды годзі! У газэтах вунь...

Гэтта ўсе злучаюцца ў агульнай гутарцы пра сучаснае становішчэ, пра грамадзянскіе справы, пра суседзкіе стасункі. Кожэн бажае выказаць свае думкі, паслухаць людзей, прапытацца пра тое, што робіцца на сьвеці. У другі дзень некалі, за працаю сьвету не бачыш, дык на сьвята назьбярэцца ці мала справункаў, аб якіх «трэ кончэ парадзіцца с суседам». Дык людзі гамоняць, бядуюць, ўздыхаюць, жартуюць, сьмяюцца. Тым часам адзін выходзіць, другі прыходзіць, і каля карчмы людзі, як каля вульля пчолы, цалюткі дзень то ў зад, то ўперад пахаджаюць. Без пярэстанку бразгае клямка, скрыгаюць завесы, стукаюць дзьверы. Пад поўдня натоўпіцца паўнютка карчма, ні раўнуючы, як на Вялікдзень у цэркаў: ані прайсьці, ані прашыцца. Часам, як пашле матка хлопчыка па бацьку, дык той наўперад ужо ведае, што лезьці ў сярэдзіну — ніхай яго агні спаляць: бацькі не знайдзеш, ногі аттопчуць, а назад ня выкарапкаешся. А то ешчэ трапіш на Сёмку, ды не палянуецца, гад, вушы выдзерці, або «квасу даць». Зараз, каб ён спрогся, запыніць:

— Чэкай-чэкай, жэўжык! Сербані—скажэ— кваску на дарогу.

Уцекай, калі ногі маеш, а то улепіцца, трасца яго галаве, за лоб ды-й пачне круціць, як шэйну-катрынку, прымаўляючы: „Ішоў чынорык цераз панскі дворык, згубіў сякерку й тапорык... Ці парог, ці качан?“ Крывішся, ведама, ад болю, абмылішся ды як скажэш: качан,—дык ён; „я йзнова пачаў: ішоў чынорык цераз панскі дворык“... Круціць, недаверак, аж покі не схамянешся сказаць: рог. Тагды ужо, тузянуўшы апошні раз, аж слёзы з вачэй пакоцяцца, скажэ: „Ідзі, леўка, за парог!..“ Уцекай не азірайся, а то йшчэ пстрычак надае: гэта ён арэхі, моў, лужэ. На вуліцы — трасцу б ён дагнаў, а тут-куды ж ты ўцячэш?! Дык, каб абмінуць гэтае ліха, хлапчына мяркуе ўскарабкацца на бочку, которая заўсё ды стаяла каля дзьвярэй; а калі на ёй знайшоў сабе прыпынак дзядзька, або й два, дык ушчэпіцца на дзьверы, а ўжо адгуль гукае, бытцым дзее ў лесі у гушчарне.

— Тата, дзе ты?

— Га, сынку!

— Ідзі, татка, да-дому, пачуднаваць.

Іншы раз і даклічэшся, асабліва, калі бацька яшчэ ня нельмі вышушы. Тады ён прапіхаецца, надходзіць, чырвоны, як з лазьні, да сына, ухмыляеццаваўсю шчэку, зьнімае яго з дзьвярэй ды кажэ;

— А мой каток, мой памоцнічак! Тату прышоў клікаць? Дай-жэ бусі тату,—баню дам.

Ухапіўшы аберуч кручаны абаранак, каторы бацька выняў з кішэні, сынок і памкнецца, даць бусі, але, як зачуе з рота у бацькі сморад гарэлкі, дык толькі нагамі задрыгае: пусьці, моў,—няхочу.

— Сьмярдзіць? пытае той. „Ну, ідзі, ідзі!.. Ох, сынок, сынок! Ты-ж думаеш, піў-бы яе, каб людскае жыцьцё нашэ? Хай-бы яе высмаліло, гэту згубу нашу!. Маленькі ты йшчэ, нічога не цяміш. Расьці, вучыся ды уцекай адгэтуль... Але хадземо,—матка, нябось, прачэкалася“, качае ён, ды абое выходзяць за дзьверы.

Яно размова размовай, а кожын мае на думцы, што добраму чэлавеку не павінна зашкодзіць, калі дзеля сьвята выпье чарку гарэлкі. Іншы раз больш і не хацеў-бы, гэтым-бы, здаецца, і здаволіўся, дык-як-жэ ты зробіш? Калі—кум стрэўся, с шваграм даўно не бачыўся, сват надыйдзе, брацейнік з заработкаў вярнуўся, і—пачнеш і пачнеш. С тым, з другім, а тым часам к змроку начастуешся, ледзьве ногаеш. Ешчэ, як скародзіш ботамі вуліцу, як дражніш сабакаў спрэчкамі з вугламі, дык — нібы крыху памятаеш. Але якім шыхам выбраўся з карчмы, як трапіў да хаты — Бог яго ведае! Не памятаеш, хто распранаў, хто раззуваў, не ў памкі, як і спаць улёгся...

А той ці іншы выпадак здарыцца с кожным можэ так не абмінеш, каб не нашлёгацца пад вечар. Тагды ў карчме ушчухаюцца спрэчкі, звадкі, песьні, — такі гоман, што крый Божэ! Гармідасія пойдзе, бадай ці ня гэтак, а можэ й горш, як даўней у Клецку на кірмашы.

— Я яму, як добраму, а ён, трасца яго матары, і нос закапыліў!..

— Выпьемо, кумок! Бог сьвяты ведае, ці будзем жывы заўтра. Пій да свата! Сватка!..

— Годзі табе, Габрусь! Вот згінённік!..

— Як-то згода?! Ен мяне зневажае, а я буду даравваць? Ні дажджэ ён...

— „Я-й пья-ніцаю ра-дзіў ся-яй, бу-ду ў карчме і ўміраць“ не пяе, а як не плачэ нехта, уткнуўшыся носам у стол.

На-вуліцы курта брэшэ,
А да мяне Янка чэшэ.
Ці ты Янка, ці ты не?
Спа-дабаўся ты мне,

перацінае пьяны Ратуй, дрыгаючы кульбамі заміж музыкі.

— Моўша! Моўша, каб ты апруцянеў, дзе цябе чэрці дзержаць! Моўша!..

Моўша гасае па карчме, як на пажэжы. Пот з яго рагамі ліецца, ярмолка збілася назад і чуць

намі і разам дабівайнося лепшай будучыны. Ешчэ іншые кажуць, што і маскаль і лях нам добра ня зычуць, дык трэба самім сабе працаваць над палепшэньнем сваей долі. Адным словам усякі добра, здаецца радзіць, але хто з іх напраўду дабра нам хочэ, дык німа ведама.

Гэта пазнаецца з іх паступкаў: хто для нас ня толькі добра гаворэ, але больш йшчэ добра робіць, той ёсць праўдзівы пріяцель.

Праука.

## Хаурускае будоуніцтва.

Цяпер, калі па усей нашай старонцы селяне расходзяцца на хутары, гаспадары павінны памятаць, што сіла у хаўрусах. Хаурусам, дружнай грамадай, многа што зрабіць саўсім лёгка, што па асобку не падсілу. Гэтак пры разсяленьні на хутары, вялікі клопат маюць гаспадары с пастройкай будынкоў. Кожнаму будавацца цяжка, а найцяжей чэлавеку маламожнаму — беднаму, асабліва, калі хочэцца, каб будынкі былі прастаронные, выгодные, каб хата была і цёпла, і сьветла, і абшырна, і каб атпорна была на агонь. А на гэты апошві варунак трэба звертаць увагу, бо найбольшае нешчасьце нашай Беларусі, гэта саломеные стрэхі на дрэўляных хатах, ад чаго бываюць частые пажары, каторые зьедаюць усё дабро, увесь дабытак. Калі у сухую ветрэнную пагоду з якой колечы прычыны загарыцца адна хата—усё сяло ідзе з дымам. С кожным годам даржэе лес, і кожны год у нашай „дрэўляна-саломенай“ вёсцы пажары глумяць людзкую працу, пажыраючы наша багацьце, родзяць беднату і сьлёзы. Той спосаб будоўлі будынкоў, які дагэтуль практыкуецца ў нашай вёсцы, зусім нядобры, даўно пара перайсці да больш новаго спасабу будаваньня, больш бэспечнаго ат пажароў.

У суседніх з намі, заграніччых старонках селяне будуюць свае будынкі с цэглы, робяць стрэхі с чэрапіцы або з жалезнай бляхі.

Варта і нам падумаць аб тым, ці ня можна было-б будовацца с цэглы. Глаўную перапону да таго, каб набудавацца с цэглы, наш селянін спатыкае у дарагавізьне цэглы. Тое, што іншые кажуць бытцым хаты мураваные сырые і сцюдзёные,—пустое.

Цэгла у нас вельмі дарагая дзеля таго, што цэглярэнь мала і што перавозка яе дорага каштуе. Дзеля гэтаго, каб набудавацца с цэглы, трэба мець блізка цэглярню. Калі цэглярня будзе належаць да чэлавека, што з гэтаго жыве і зарабляе гэтак, то цэна цэглы не шмат панізіцца. Каб цэгла танна абхадзілася і каб нашы селяне маглі будаваць свае будынкі с цэглы, трэба устраіваць хаўрусные цэглярні. каб цэгла выраблялася не дзеля заработку, а на свае патрэбы. Невялічкую цэглярню у вёсцы можна абарудаваць за 300—500 рублёў. Грошы на гэта можэ вёска пазычыць у банчку. Ды. нам здаецца, у тых губэрнях дзе ёсць земства, то яны-б ахвотна пазычылі селянам гэтые грошы з страхавых капіталоў, бо ім жэ самім карысна, каб селяне будавалі агне-атпорные будынкі.

Пры хаўруснай рабоце, цэгла абойдзецца, калі наймаць майстроў, не даражей, як 6 — 7 руб. за тысячу, а калі самі селяне па чародзе будуць адбываць работу на цэглярні, то і шмат танней бо толькі тое, што каштуюць дровы на выпалку цэглы. Грамада вялікі чэлавек. Грамадой усё можна зрабіць і ўсё лёгка дасца. Само-сабой калі-б цэглярню будаваў адзін гаспадар на свае патрэбы, то гэта яму лішне дорага абойдзецца. Але саўсім іншая справа, калі за гэта возьмецца вёска вялікая, у каторай ёсць якіх 50 —100 хат.

Карысць хутарскай гаспадаркі кожнаму зразумела. Гаспадар на сваім кавалачку зямлі, хоць-бы у колькі дзесяцін, калі яе мае ўсю каля хаты, можэ ня згорш жыць, а той-жэ самы чэлавек у вёсцы перэбіваецца толькі, як кажуць с хлеба на квас. Разселяцца адразу ўсей вёскай, многа дзе не спадручна, але можна выдзеляцца „на отрубы“ на колькі хат з вёскі; гэткім парадкам можна памалу разселяцца і будавацца, і гэта лёгка даецца, калі селяне возьмуцца грамадай —хаўрусам за гэту работу.

Лемеш.

## Чужым.

Мы вас прынялі хлебам і соляй,
Людзі чужые;
І стрэлі вас ласкай нашаго поля
Кветкі жывые.
Нашы сасонкі шумнаго бора
Далі вам хаты,
Далі загонаў нашых разоры
Гонар багаты.
Пух і аўчынкі нашаго хову
Грэлі зімою,
Птушкі вам гралі з нашай дубровы
Гымны вясною.
Ценям тулілі вас у сьпякоту
Нашы чарэсьні,
Нашые жнейкі ў жніўну рабсту
Пелі вам песьні.
Вашым патомком нашые маткі
Казкі складалі:
У сэрцах дзіцячых праўдаў пачаткі
Сеў засевалі.
Верны славянскім статкам, браточна
У госьцях вас мэлі
І шанавалі людзка, сьвяточна
У будні, ў нядзелі.
. . . . . . . . . . . . . . . . . .
Сотні лет песьцім днямі і ночай
Госьця на шыі—
Зьмея, што с пуняў скарбы валочэ,
Скарбы чужые.
Вы ўжо забылі, людзі здарэньня,
Дзе ваш прыпынак,—
Вывелі ў гандальславу, сумленьне—
Праўду на рынак.
Сьлепа зракліся сораму, ўвагі,
У хорамы селі,—
Брацьцям-жэ ўзьдзелі лапці, сермягі,
Торбы надзелі...
Людзі чужые! Хтось калісь злічэ
Вашу нам шкоду:
Злічэ праступкі... к суду паклічэ
Крыўда народу.

Янка Купала.

Спб. 18/х 1912.

## К Дудару Арцему *)

### ат надзвінскага мужыка.

Што табе, дудар, прысьпела
Сьмелы песьні завадзіць?
Ці то лёгкае, брат, дзела
Нашу брацьцю прасьвяціць?
Крыкнуць на цябе паноўя,
Што ты шкоднік і місьцюк,
Страціш голас і здароўе
І дуду упусьціш з рук.
І абмыешся сьлезамі,
І падумаеш не раз:
„Божай ласкі нет над намі

*) Верш гэты напісаны Арцёму Вэрыге Дарэўскаму у яго альбум. Вэрыга-Дарэўскі ў сярэдзіне XIX сталецьця быў цэнтрам беларускаго руху; сам ён шмат пісаў па беларуску, але з яго твороў цяпер нядомы адны, бадай што, толькі загалоўкі. А Вэрыга-Дарэускі шмат пісаў:—вядома колькі загалоукоу, напісаныхъ ім паэм і пераклад Конрада Валенрода А. Міцкевіча. Калі-б хто з нашых чытачоу і прыхільнікоу ведау што аб А. Вэрызе-Дарэускім, ці меу-бы якіе творы яго у сябе, то вельмі-бы мы прасілі прыслаць у Рэдакцію, для апрацаваньня яго біографіі.

Рэдакція.

каб-жэ той розум наўперад, што надыходзіць ззаду! Гэтак ужо вядзецца: пакаштуеш разок таго, што забаронена, ды потым ня лёгка стрымацца, каб не пакваціць на што-небудзь горшае і шмат шкадліўшае. Падцюкнуў чорт, закарцела і папугаю. Сперша боязна ды неяк усьцішна здавалося, але жаданьне навін ды прыродная памаўзлівасьць перэважылі страх. Узмахнуў скрыдламі папугай ды шыбануў пацешыць вока сваё вольным сьветам. У памкі яму гэта раніца, канаючы ня мог ён забыцца яе.

Шчэбеталі ластаўкі на крокввах, ціўкалі верабейчыкі па гуменьнях; па дварох пішчэлі гусеняты, гергяталі гусі; моцна, прыседаючы мусі, кракалі качкі. Мэрам нехацяс прасоньня, рыпелі на ўселякіе лады вароты, скрыгалі весьніцы і спаважна грукалі засовы. Сціху, нібы прабуючы горла, рыкало быдла, блеялі ягняты, мяркаталі авечкі. Недзе здалёк заіржало жэрэбя, яму адклікнулася матка. Скрыпела студня, грукалі вёдры, чулася жаночая размова. Пападвоку бегаў хлопчык, ляскаў пугаю па зямлі ды раз-по раз выгукаў: „Быдла выгача-яй!“ Вёска прачнулася, гаманіла, гула, як вулей с пчоламі падчас раеньня.

Папугай імчаўся далей, за вёску.

Хмурнеўся навокала маўчозны, насуплены лес. Здавалося, бытцым ішоў ён, спыніўся ды замысьліўся, абступіўшы ваколіцы цёмна зялёнымі мурамі. З лесу, як з-пад зямлі, чуць чуваць данасілося кукаваньне зязюлі. Срэбрам бліщчэла на сонцы рэчка, абапол аброслая купчастымі вербамі, алешнікам, тонкім гушчарлазьнякам. Сонцэ купалося ў вадзе, і вада зьяла, усміхалася, падобна да люстра ў каштоўнай зялёнай аправі. Сярод парасьніку на узлесьсі вышэлі магутные дубы, трымаючы на гальлі, як абярэмя ламья на галаве, бусьліные гнёзды. У гнёздах на аднэй назе, як на тонкім чырвоным пруце, стаялі буслы ды, падняйшы ўгару дзюбы, ляскаталі з радасьці, мусіць, што даў Бог харошы дзянёк і ў іх ня горш, як у іншых: ёсьць і гняздо, будуць і дзеткі. Знізу-ж пад гнэздамі за нешта сварыліся шпакі з верабьямі. Па той бок—распасьціраўся шырокі, роўны луг, прыбраны ў кветкі, як маладая да шлюбу. Гэтта—доўгімі зялёнымі устужкамі рунеліся ніўкі з дзікімі грушамі, яблынямі с кудзёркамі ракітніка па межах. А там—пад гарою, прытуліўся шэры будынак з белым, агорнутым гаем бярэзьніка, касьцёлам пасярэдзіні. Адтуль-жэ выбегала, абгароджэная ў дзьве жэрдкі, дарога ды шпарка імчалася па полі. Яна закрыўлялася, выпроствалася, выкручвалася, як вуж, ва ўсе бакі, разбегалася чорнымі сьцежкамі, а потым, стрэўшы другую, пускалася с тою на выпярэдкі, аж покі не зьнікалі абедзьві за пясчаным узгорками...

Сьпевалі жаваранкі, і песьні іх, як нязлічонае мноства срэбных звонікаў, звінелі, зліваліся у нябёсах, абрываліся, як струны, зноў пачыналіся, а гуртам рабілі адно цудоўнае, благаснае набожэнства, адну велебную ўдзячную канту.

Наагул, усё было аздобна, слічна і пекна, як „у сэрцы чэлавека ў часіну шчырае малітвы“.

Задрымацело сэрцэ ў папугая ад хараства Божага сьвета! З велкае, нястрымалае, радасьці ён ня чуў сваіх скрыдлаў: лётаў ўзад нёсся у перад, садзіўся, ўзнімаўся, імчаўся ў выш, спускаўся ў ніз і—ня мог нацешыцца, ня мог паглядзецца. Аж покі не супакоіўся на крыжы, што, як сівы дзед, маркотна схіліўся на дарогу, стоючы каля маленькае трухлявае капліцы. Сеў—ды засмуціўся. Чаго? Якая журба агарнула душу яго, які смугак сціснуў сэрцэ яго? Хто гэта скажэ?! Хто можэ ведаць што дзеецца на патаемных закуцьцях чужой душы, хто калі бачыў сакрамэнты чожога сэрца? Мо горкі жаль адзіноцтва апаваў яго, а мо—сьпевы чужаніцы пабудзілі змоўкшые песьні далёкай бацькаўшчыны і ўскалыхнулі пачуцьця роднай краіны? Бо нельга забыцца аб тым, што крывавым атрамэнтам упісаноў сэрцэ; немагчымосць нікому й ніколі страціць тые пачуцьця, што агарнулі душу пры яе нараждженьні. Ніхто ніколі, ад скананьня, не забудзэ тых журботна-вясёлых песень, якіе сьпевала матка, схіліўшы галоўку над калыскаю свайго дзіцяці! Есць можнасьць занедбаць, занехаяць; можна прыспаць. ўсё гэта, заглушыць, як брыдкае зельля глушэ ніўку у недбалага, але надыйдзе час, страсянецца душа і яно ачнецца, загарыць, запылае, як на ветры ад іскры с попялу патухлае вогнішчэ!..

Зажурбёны, змаркочэны, апанаваны роем нахлынуўшых думак, сядзеў папугай і не ў галаве аму, што сваей яркай адзежкай, сваім незвычайным абліччэм звярнуў на сябе увагу тутэйшаго птаства. Не рад ён быў, што маці справіла яму калерыстую вопратку, што дала адметную уроду...

Першы убачыў яго грач. Той з маленства звучыўся шанаваць здароў'е а дзеля гэтаго меў звычай, устаўшы раніцаю, ісьці на шпацэр па вольнім паветры. Заўсёды прыбраны, як грап, у чорны сурдут, ён пахаджае сабе па дарозі, як штосьці заманулося яму глянуць, ці высока сонцэ. Павярнуўшы галаву на бок, ён зірнуўды—аж прысеў на хвост, зглядзіўшы на крыжы папугая. Апамятаўшыся, трэйчы сплюнуў с пераляку ды з гэтым нечуваным дзівам падаўся у бярэзьняк да сваіх. Неўзабаві, хістаючыся, як на гойдаўцы, шпарка ляцеў, на крадзеж, мабыць, стары верабей. На дарозі агледзіўся ён, што забыўся пайстрыць дзюбу, але варочацца дамоў не хацеў, маючы на думцы, што гэта зрабіць можна на крыжы, на якім часта давадзілося спачываць, вертаючыся здалёк да дому. Мейсца было добра знаёмае, ён ужо і лапкі выпраставў, каб прысесьці ды—як той д‘ябал адхіснуўся у бок. Сопалаху ён забыў мусі, што мае язык, бо нейкі час метусіўся моўчкі, а потым нарабіў такога гвалту, што з усіх бакоў, як на пажар, пачалі злетацца верабьі, ластаўкі, жаваранкі, сьмяцеі. Страхоцьця, колькі іх назбіралося!

— Уга, уга! дзівіўся папугай, зірнуўшы у другі бок: „там йшчэ чэрадь прэцца“ Гэта грач сваякоў вёў, а за тымі, бытцым бабы, каўдыбалі вароны; крыку ззаду церушылі скрыдламі, як маладзіцы, падсеваючы жыта, рэшатам, сівабокіе галкі.

— Сварацца яны жэняцца, ці якое ім ліха? пацягаў плячыма папугай ды чэкаў, што будзе далей. Але чэкаць доўга не прышлося. Распачаў справу той самы жэўжык—верабей. За ім уся гэта арава с піскам. с крыкам рынулася на бедалашчага папугая ды як пачалі пітляваць. Як пачалі субасіць, джгаць—Божухна мой літасьцівы. Іскры сыпаліся з вачэй, пух ляцеў, як з разпоранае падушкі, ня ведаў бедак, за які бок хутчэй хапацца! Ён зваліўся с крыжа воб зямлю, зашыўся пад плот, пад віткі, але не было ратунку. Ды дзе ў чорта! йшчэ горэй бо верабьі, прымасьціўшыся на вітках, дзяўблі з верху па галаве, як кавалі малаткамі па кавадлі...

У гэты момэнт натрапіў сюды Моўша. Ён хутка агледзіўся, што папугай уцёк с клеткі, ды ўжо цяперсі шукаў яго па полі.

— Ой, вэй мір, вэй мір, заенчыў ён, ўсплясьнуўшы рукамі, як угледзіў гэту багалію. Папугай саўсім змогся, аслаб, ён ужо не бараніўся, не асекаўся, а толькі як с плачэм, крычаў:

— Ня ўсе-ж разам, ягомосьці! Трымайся чаргі калі ласка!

Я. Лёсік.

„І нет праўды сярод нас“.
Ты мяне аднак ня слухай
Мала што я завяду!—
Цэлай грудзьдзяй дуй і дмухай
У жалейку і ў дуду!
Не гнявіся за абмылку,
Што зачаць я не пасьмеў:
Калі Бог табе даў сілку—
Дуй, як дуў,—пяі, як пеў!
Грудзяй цэлай гудзі сьмела,
На увесь мужыцкі сьвет,—
Што пасееш, будзець цэла;
Будзець некалі і цьвет...
То то радасць, радасць будзець
Калі Бог за мужыкоў,
Ды вянок табе прысудзіць
З белых рож і васількоў!
Белы рожы—то за гэта,
Што ты совісць беліш нам,
Што нас вывёў ад Яхвэта,
Хоць наш бацька, вучуць, хам.
Васілкі—то, брат, нябёсы
Аткуль кожны Божжы дар,
Аткуль сонцэ, дожджык, росы,
Аткуль мы і ты, дудар.—
Так мой мілы брат Арцёмка
Бог цябе благаславі!
Іграй шчыра, пяі громка
І жыві нам, ды жыві!

Ялегі-Пранціш Вуль.

Вітэбск 23 марца 1859 г.

## З Беларусі і Літвы.

**Мядзель**, Вілейскаго павету. У нашым Мядзелі жыцьцё выяўляецца толькі у кірмашах. Разных кірмашоў тут шмат. Есць да волі і школ; каб было горадзкое вучылішчэ не пашкодзіло-б, бо да Вілейкі даволі далёка ездзіць вучыцца. Дзьве цэркві, адзін касьцёл сюды сьвятам сьцягваюць шмат людзей з усіх вёсак. Самые мястэчкі (іх два у адным мейсцы: Старое-Мядзело і Новае-Мядзело) абодвы каля возера Нароч і з далёку усякаго вітаюць сваімі вежамі цэрквоў і касьцёла.

Жыцелёў у Старым-Мядзелі каля 6—7 тысяч, з іх шмат хрысьціянъ, а больш усяго жыдоў, каторые на ўсіх вуліцах таргуюць уселякімі таварамі, як у якім наветовым горадзе, і толькі дзівішся, аткуль тут можна жыць с таргоўлі?

У Новым-Мядзелі, пасьля пажару (таму шмат гадоў) памешчык не даў зямлі жыдам будавацца, так, што цяпер там жыдоўскіх крамаў саўсім мала і тарговых днеў тут не бывае, а толькі два-тры кірмашы, а таргі у Старым-Мядзелі бываюць кожны чэцьвер. Пачтовае аддзеленьне стаіць не на мейсцы, не там дзе трэба: яно у Новым-Мядзелі у доме памешчыка Козэлло-Поклеўскаго, каторы арэнду бярэць зусім малую за дом, абы толькі почта была у дварэ. Напрыклад торг, ці кірмаш у Старым-Мядзелі, да 10 тысяч рознаго пароду, а пісьмы трэба насіць за вярсту блізка на почту у Новы-Мядзель, калі праз возера ісці, а як кругом, то будзе са дзьве вярсты і з гэтым надта дрэнна усім, але ніхто не адважыцца прасіць каб перэнясьлі почту у Стары Мядзель. *Мядзельскі.*

**Трабы**, Віленск. губ. Часта чуем, што палякі хочуць апалячыць беларусоў, што у беларускай мове што раз болей слоў польскіх, адным словам „ляхі“ так апанавалі бедных беларусоў, што ні рады даць! Але той, хто часьцей бачыць беларусоў, слухае іх мовы і добра прыглядаецца і прыслухаецца—той бачыць, што за апошніе 10–12 гадоў апалячыліся мы не так, як абруселі на ўсе бакі! І мова стала больш падобнай да маскоўскай і танцы і песьні перэмяніліся. А хто найбольш гэтых чужых навінак да нас прыносе? салдаты, што варочаюцца з далёкай службы да хаты. Прыедзі с Пецербурга, або ешчэ скуль нашъ Янка, або Сымонка і глядзі адкуль узяўся Сямён, Іван. А песьні-ж, песьні! Добра калі расейскі чэлавек сьпевае аб сваей найбольшай рэчцы, але калі гэта Ганулля, ці Марыля гэтак выводзе, дык неяк і сьмех бярэ і жаль, што чужое нашым маладым мілейшае, як сваё. ці-ж гэта мы ўжо і запраўды такіе ад Бога закіненые, што і песьнёў сваіх не маем і гаварыць без чужых слоў не трапім. Гаварылі-ж і сьпевалі бацькі нашы і добрые і вясёлые і жаласьлівые і сьмяхотные песьні. Калі старых нам ужо мала песьняў, то хай-бы новые складалі, або зложэные сьпевалі. Паглядзіце-ж вы на лісты, якіе пішуць да вас дзеці вашы съ чужой стараны: блізка ўсе пішуць па расейску. І пісаць яму, беднаму трудна, ды і чытаць ня лёгка, як навядзе, дык Бог яго ведае, чаго ён хацеў! Усё паклоны, ды паклоны, а аб тым, як яму там жывецца, якіе там людзі, які край, нічога не напісана. Каб пісаў па свойму, то пэўне патрапіў-бы лепей усё чыста расказаць, познали-б хатніе лепей што кольвечэк, што гэта сынок, ці брат, ці муж пішэ. А дзе праваслаўных шмат, там ешчэ горэй: слоў маскоўскіх ешчэ болей убілося у моду. І ня ведаю я чаму гэта так? Есць каталіцкіе катахізмы на беларуску, а праваслаўных дык німа. Ці-ж праваслаўным беларусам не было-б так сама лягчэй вучыцца сваей веры у сваей роднай мове? Ці гэта пацероў праваслаўных ня можна казаць па беларуску, а каталіцкіе дык можна? Вось жэ браты беларусы ня трэба нарэкаць на нікога апроч сябе, калі у чым не маеце правоў; трэба самім старацца і пільнавацца каб дзеткі вашы гаварылі па своему, не калечылі нашай старой, чыстай мовы беларускай, ві на расейскі ні на польскі лад, не стыдаліся яе, але шанавалі яе; вучыліся што раз лепей, харашэй гаварыць ей.

*Маркоўская.*

**В. Мушэнка**, Даўгіноўской воласьці. Гаспадар Н. унёс у хату кадушку ад капусты і загадаў жонцы, каб яна наварыла вады і выпарыла яе. Неўзабаве у кадушку улез сын Н. і там начаў гуляць. Гаспадыня заварыўшы вады і не паглядзеўшы, ці німа там чаго, чабыхнула варатак у кадзь і... зварыла хлопца.

*Ф. Кр—скі*

**Юцэвічы**, Крайск. вол. Вілейск. пав. Палясоўшчык тутэйшаго пана Барэўскаго не надта даўно быў злавіў у сваім абходзе хлопца з вёскі Юцэвіч, каторы рубаў лес і ён данес аб гэтым пану. Пан падаў на суд і прысудзілі 7 рублёў штрафу. Хлопец жыў у вёсцы з аднэй маткай-старушкай і не надта меў чым заплаціць штраф. Па злосьці начаў ён старацца, каб як небудзь адплаціць палясоўшчыку і не ўзабаве адплаціў. Палясоўшчык прышоў у в Юцэвічы да баб, каторые таргуюць гарэлкай, выпіць і там забавіўся і варочаўся ужо с прыцемнам, а хлопец дапільнаваў з за вугла, і выскочыўшы, заехаў калом на пераносіцы, так, што зраўнаваў нос, другі раз справіўся на галаве і дакончыў палясоўшчыка. Палясоўшчык той час памёр, а хлопец на заўтра, закаваны у ланцугі, пашоў на казённы хлеб.

*Красоўскі.*

## З усіх старон.

**Пецербург.** 2 лістапада раніцай, пасьля доўгай хваробы, памер пецербурскі мітрапаліт Антоній. Мітрапаліт Антоній—ў сьвеці Александр Вадновскі—сын сьвяшчэвіка тамбоўскай губэрні. Нарадзіўся у 1846 гаду, пастрыгся у чорнцы у 1863 гаду. У 1898 гаду пасьля сьмерці мітрополіта Палладія нябошчыка назначылі мітрополітам пецербурскім і ладажскім.

= Газэты пішуць, што мае выйсці у адстаўку Каковцев, або Макаров. Прэдседацель міністроў нездаволены рэзультатам выбороў. Ен дакарае Макарову тое, што той, разбіўшы цэнтр, ня здалеў злажыць правай большасьці. Калі у Думе будзе больш правых, тады выйдзе у адстаўку Коковцев, а на яго мейсцэ будзе назначэн Крывошэін, каліж думская большэсць зложэна будзе с правых і акцябрыстоў выйдуць Макаров і Кассо.

= Коковцэв гэтымі днямі запрапанаваў прафэсару Платонову стацца міністрам асьветы.

= У клубе націоналістоў растрачэна 30 тысяч рублёў з выдавецкаго капіталу. Атказ за растрату падае на Крупенскаго. Спадзеваюцца суда. Крупенскій выходзіць з національного клубу і саюзу.

= Сэнатор Мэдэм закончыў абработку матерьялоў рэвізіі кітайскай чугункі. Сэнатар выкрыў там хабарніцтва і ўсякіе штукі, асабліва пад час вайны. Але міністр дарог Рухлоў павярнуў правы усім, пацягнутым пад суд праз сэнатора Мэдэма. Іншых з аддадзеных пад суд нават падвышэна па службе. Кажуць, што дакладную запіску сэнатара не пададуць на Высочайшы разгляд.

**Кіеў**. Колькі дзён таму назад памер у Кіеві слаўны украінскі музыка-композытор Мікалай Лысэнько, каторы напісаў многа опэр і песьнёў украінскіх. Нарадзіўся у 1841 гаеу у Жоўпіне, Палтаўской губ. Аканчыўшы гімпазію у Харкаве, а пасьля унівэрсытэт у Кіеві, пасьвяціўся музыцы, да каторой меў з малых лет вялікую здольнасць. Пасьля колькі гадовой навукі музыкі за граніцай і ў Пецярбурзе у найлепшых прафэсароў, вертаецца нябошчык у Кіеў і начынае многа працаваць над развіцьцем украінскай музыкі. За сорак гадоў сваей працы Лысэнько напісаў колькі надцаць опэр, с паміж іх найбольш вядоны: „Чорнаморцы“, „Тарас Бульба“, „Энэіда“ і інш. Найбольшую-ж аднача славу прынясьлі для Лысэнько яго зборнікі украінскіх народных песень. На похаранах заслужэнаго кампазытара і грамадзянскаго працоўніка, якім быў Лысэнько, сабраліся тысячы украінцоў. Хай лёгкай будзе яму родная украінская зямліца, каторую ён шчыра любіў!

**Севастопаль.** Протэстуючы проці прысуду над матросамі у Севастопалі забаставалі работнікі. Бастуе усяго каля 46 тысяч душ. Бастуюць велікіе і малые фабрыкі. На вялікіх заводах тысячные тоўпы народу хацелі зрабіць дэмонстрацыі, сьпеваючы пахаронны марш. Верхаводоў арэштавалі. Скрозь пастаўлены вялікіе нарады паліцыі. Забаставалі и борщчыкі у шмат якіх друкарнях. Праз забастоўку не маглі выйсці газэты „День“, «Луч», «Правда», «Земщина».

**Орэнбург**, З Орэнбурга паведамляюць, што ў тургайскай обласці пануе голад. Людзі началі хварэць на цынгу. Губернатар стараецца, каб прыслалі лекарскую і харчавую помач.

Рэдактар-Выдавец
А. Уласоу.

Вучоны садовод Ю. Паўловіч аткрывае 12 лістапада (ноябра) у горадзі Вільні курсы садоводзтва і пчэлярства. Чытаць лекціі будуць:

**«Аб агародніцтве і садоводзтве»**
п. Ю. Паўловіч.

**«Аб жыцьці расьлін і глебазнаустве»** Вучыцель камэрчэскай школы
п. З. Грыневіч.

**«Аб фруктовых вінах»**
інжэнер п. Баршчэўскі.

**«Аб біопсыхологіі расьлін»**
доктар п. Краінскі.

Курсы будуць да Каляд кожны дзень ад 5 гадзіны да 8-й вечэрам. Па сканчэньню курсоў вучэнікам будуць выдаваць атэстаты. Аб варунках паступленьня даведацца можна у канторы Ю. Паўловіча: Вільня, Ботанічная вуліца, дом № 1.

**СТОЛЯРЪ**

Двухнедѣльный иллюстрованный литературно художественный журналъ, посвященный столярному искусству.

**Годъ изданія четвертый.**

Принимается подписка на 1913 г.

**ПОДПИСНАЯ ЦѢНА:**

На годъ . . . . . . . . . . 5 руб.
„ полгода . . . . . . . . . 2 р. 60 к.
„ 3 мѣсяца . . . . . . . . 1 р. 40 к.

Адресъ: С.-Петербургъ. Корпусная ул. 28

**ZIEMIA**

**tygodnik krajoznawczy illustrowany**

Zamieszcza artykuły, illustracje, dotyczące Litwy i Białej-Rusi.

Adres redakcji i Administracji: Warszawa Al. Jerozolimskie 29—1.

Przedpłata rocznie . . . . rb. 6
Półrocznie . . . . . . . . . 3 r. 50 k
Kwartalnie . . . . . . . . 1 r. 65 k

Redaktor Kazmiérz Kulwieć.

НАЙЛЕПШЫ СПОСАБ ЗАБЕСПЕЧЫЦЬ СЯБЕ І АБАРАНІЦЦА АД БЯДЫ—ГЭТА

**СТРАХОУКА ЖЫЦЦЯ**

**у Першым Узаемным Таварыстве Страхаваньня Жыцьця 1902 г.**

Найлягчэйшые варункі.
Найменш трэба плаціць за страхоўку.
Выдаюцца пазыкі пад полісы за 6%.
Едынае чыста УЗАЕМНАЕ ТАВАРЫСТВО.
Страхавацелі атрымліваюць частку даходу і загадываюць справамі Таварыства.

**Упраўленьне Літоўска-Беларускаго Округа:**
Вільня, Георгіеўскі праспэктъ, 4. Тэлефонъ № 830.

**ПАТРЭБНЫ РУПНЫЕ АГЕНТЫ.**

**ЕЛКА ПО ПОЧТѢ**

Настоящимъ увѣдомляемъ нашихъ покупателей, что по примѣру прошлыхъ лѣтъ мы начали высылку коллекцій украшеній и сюрпризовъ для ёлки.



**НАШИ УСЛОВІЯ ИСКЛЮЧИТЕЛЬНЫ.**

Пересылка въ пред. Европ. Россіи **за счетъ фирмы.**
Отправка коллекцій наложен. платежомъ **безъ задатка.**

*Коллекція изъ 106 предм. 1 руб. 90 коп.*
*Коллекція изъ 155 предм. 2 руб. 50 коп.*
*Коллекція изъ 218 предм. 3 руб.*
*Коллекція изъ 316 предм. 5 руб.*
*съ перес.*
*Кол. изъ 409 пр. 8 р., изъ 465 пр. 10 р., изъ 622 пр. 15 р., изъ 772 пр. 20 р., изъ 908 пр. 25 р. съ пересылкой.*

Въ интересахъ постоянныхъ покупателей въ этомъ году мы удачно измѣнили содержаніе коллекцій и дополн. ихъ интересн. новинками.

РОЖДЕСТВЕНСКІЙ БАЗАРЪ **И. ГЛАЗУНОВА.**
Москва, Столешниковъ, № 8.

Добросовѣст. и аккуратн. выполн. заказовъ гарантируется.
Описаніе коллекцій и каталогъ подарковъ **безплатно.**

Друкарня „Артель Печатнаго Дѣла“, Віленская 25, тэлеф. 199.